# Унікальныя выданні твораў В. І. Леніна

На выстаўцы ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна ў Мінску пачэснае месца займаюць творы В. І. Леніна, выданыя ў дарэвалюцыйны час у канцы мінулага і пачатку гэтага стагоддзяў.

Тут прадстаўлена кніга, якая друкавалася яшчэ ў 1899 годзе—50 год назад—«Развіццё капіталізма ў Расіі». Кніга выйшла ў Пецербургу. Гэта найбольш старое выданне твораў В. І. Леніна, якое ёсць у бібліятэцы. Побач—рэдкае выданне вядомай працы «Што рабіць?», надрукаванай у 1902 годзе ў Штутгарце.

Кнігі «Крок уперад, два крокі назад», «Земская кампанія і план «Іскры», «Дзве тактыкі соцыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэвалюцыі» і рад іншых былі надрукаваны ў Жэневе. На іх адзнакі: «Друкарня партыі», «Выдавецтва соцыял-дэмакратычнай літаратуры», «Кааператыўная друкарня». Праца «Аграрнае пытанне і «крытыкі Маркса» была выпушчана кнігавыдавецтвам «Буревестник» у Одэсе, а праца «Соцыял-дэмакратыя і выбарчыя пагадненні» ў Пецербургу.

На выстаўцы прадстаўлен таксама амаль поўны камплект ленінскай «Іскры».